Маліна
Вольга Аляксандраўна
(1878 - 1945) -

- адзін з першых бібліятэкараў высокай кваліфікацыі ў Савецкай Беларусі. Працавала ў Дзяржаўнай бібліятэцы БССР імя У. І. Леніна з першых дзён яе арганізацыі пры Універсітэце ў 1921 г. па 1937 год і ў 1944 - 1945 гадах.

Вольга Аляксандраўна загадвала аддзелам апрацоўкі, а потым даведачна - бібліяграфічным аддзелам, узначальвала работу па класіфікацыі і арганізацыі сістэмы каталогаў бібліятэкі.

У час Вялікай Айчыннай вайны Вольга Аляксандраўна, ў пажылых ужо гадах, была ўдзельніцай падпольнай групы Жумава ў 3-й клінічнай бальніцы. Пасля вызвалення Мінска, з 20 ліпеня 1944 г. яна працуе галоўным бібліятэкарам у Дзяржаўнай бібліятэцы БССР імя У. І. Леніна. У 1965 годзе пасмяротна ўзнагароджана медалем „За баявыя заслугі."

Рашэннем пашыранага паседжання мясцкома ад 8 жніўня 1972 г. за доўгую і бездакорную працу ў Дзяржаўнай бібліятэцы БССР імя У. І. Леніна і ў азнаменаванне 50-годдзя з дня яе заснавання В. А. Маліна занесена ў Кнігу Народнай Славы бібліятэкі.